*М.І. Чмарава*

# ЧЭШСКАЯ ЛІТАРАТУРА 1990–2000-х гг.: АСНОЎНЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ І МАСТАЦКІЯ ПОШУКІ

Пра сучасную чэшскую літаратуру мы можам меркаваць толькі прыблізна, паколькі гаворка ідзе пра жывы літаратурны працэс, дасюль не абмежаваны. Чытач і літаратурная крытыка толькі пачынаюць звяртаць увагу і пазначаць, акрэсліваць некаторыя літаратурныя тэндэнцыі, такія, як, напрыклад,



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

адхіленне ад постмадэрнізму. Спатрэбіцца пэўны час, каб занесці на карту чэшскага пісьменства асобных аматараў, ацаніць іх мастацкую каштоўнасць і комплексна прааналізаваць шэраг літаратурных з'яў, даць імя, паставіць іх на нейкае пазначанае месца.

Больш за ўсё нас цікавіць чэшскі літаратурны працэс 1990-х гадоў. Пасляльістападаўскі пераварот 1989 г. выклікаў у чэшскім грамадстве не толькі палітычныя змены, ён стаў пачаткам і значных літаратурных пераўтварэнняў. Быў зрушаны падзел на літаратуру афіцыйную і неафіцыйную. Усе тры плыні, якія існавалі дагэтуль (літаратура, якая выдавалася афіцыйна, самвыд і эміграцкая), у 1990-я гг. зліліся ў адну магутную плынь, хаця пэўны час яшчэ захоўвалі свае адрозныя рысы і характарыстыкі. Феномен чэшскай літаратурнай сітуацыі апошніх дзесяцігоддзяў заключаецца ў тым, што на паліцах магазінаў апынулася адразу ўсё. Паўстала праблема выпрацоўкі новых крытэрыяў для ацэнкі літаратурных твораў без агляду на тое, калі і ў якіх умовах гэта стваралася. Зніклі цэнзурны падыход, дзяржзаказ, дзяржкантроль, якія з некаторымі перапынкамі існавалі амаль з 1930-х гг. Літаратурнае жыццё пачало развівацца без штучных перашкод. Распаўся Саюз чэшскіх пісьменнікаў, утварылася новая арганізацыя Obec spisovatelu, якая аб'ядноўвае літаратараў розных ідэйных і мастацкіх пазіцый. Эміграцкія выдавецтвы цэнтр сваёй дзейнасці перанеслі на радзіму. Узніклі сотні выдавецтваў, якія лавінай абрушылі на чытача кнігі забароненых раней аўтараў (Вацуліка, Гавэла, Шкворацкага і інш.). Дасягнула роскві́ту папулярная масавая літаратура, пашырыліся кантакты з цэлым светам. Пры гэтым парадаксальна, але факт, што сёння ў чэшскай літаратуры амаль страчваецца сувязь з блізкай славацкай літаратурай. Пашыраецца колькасць перакладных твораў і, як вынік, уздзеянне сусветнай літаратуры на мастацкую эстэтыку чэшскіх празаікаў і паэтаў. Перастаў існаваць "Літаратурны штотыднёвік", але з самвыдацкага падполля выйшлі "Народныя навіны" і мноства розных грамадска-культурных часопісаў. Прыйшла ў заняпад "фучыкаўская" "Творба", але новае жыццё атрымалі "Літаратурныя навіны".

Наступіла тая свабода, пра якую марыла цэлае пакаленне чэшскіх пісьменнікаў. Аднак многія даследчыкі літаратуры адзначаюць небывалы літаратурны хаос, паколькі да чытачоў разам прыходзяць творы розных часавых пластоў, розных ідэйных кірункаў, кнігі, што гадамі і дзесяцігоддзямі ляжалі ў шуфлядах, і модныя сезонныя навінкі. Але недзе ў сярэдзіне 1990-х гг. з'явіліся вельмі сур'ёзныя і прафесійныя выданні, якія дапамагаюць арыентавацца ў гэтым літаратурным моры апошніх дзесяцігоддзяў. Тут можна згадаць "Panoramu česke literatury" (1994), "Slovnik česke prozy" (1945–1994) і некаторыя інш. Нямала ўвагі даследчыкі надаюць і каменціраванню асобных сучасных твораў, памнажаюцца аналітычныя працы, артыкулы, прысвечаныя



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

разгляду асобных перыядаў, літаратурных пакаленняў, развіццю жанраў, адносінаў палітыкі і літаратуры. Тым не менш чэшская літаратура і асоба пісьменніка ў 1990-я гг. страчвае тую ролю, якую яны адыгрывалі да 1989 г. на працягу стагоддзяў (і гэта без перабольшвання). Паэзія і проза сталі проста прыватнай справай, якая больш не аказвае значнага ўплыву на грамадскае жыццё, як было дагэтуль. З гэтай думкай можна даволі часта сутыкнуцца на старонках чэшскіх літаратурных выданняў. Прэстыж і павага, якія адчувалі пісьменнікі ад часоў рамантызму да эпохі авангардных школ, на думку многіх сучасных аналітыкаў, прыкметна паменшыліся. Спецыфічна чэшская "будзіцельская" роля літаратара-мастака адыйшла ў небыццё. Нават той факт, што на чале дзяржавы пасля аксамітавай рэвалюцыі становіцца пісьменнік Гавэл, драматург Угдэ ўзначальвае парламент, а прэм'ер-міністр Клаус з'яўляецца членам ПЭН-клуба, успрымаецца большасцю чэхаў сёння як збег абставін, а не доказ ролі літаратуры ў сучасным грамадстве. Адзін з вядомейшых сёння чэшскіх пісьменнікаў І. Кратахвіл з сумам падкрэслівае, што "месіянерская функцыя літаратуры, якую яна несла з часоў чэшскага нацыянальнага адраджэння, згасае. Кнігі не ўспрымаюцца больш як культавыя рэчы, што заўсёды было характэрна для чэшскай культурнай традыцыі" (пераклад з чэшскай мовы наш. – М. Ч.) [1, с. 34].

Аднак такое становішча не можа быць вечным. Ужо цяпер з'явіўся шэраг новых імёнаў у чэшскай літаратуры. Гэта Тыплт, Піжл, Крэмлічка, Касал, Яхім Топаль, Спраўцава, Мурэр, Т. Кафка; з сярэдняга пакалення – Айваз, Годрава, Ржэзнічак і інш., якія больш не бачаць мастака як рупар нелітаратурнай ідэі. У духу постмадэрнізму яны лічаць літаратуру і мастацтва складнікамі чалавечай свядомасці, яны чаргуюць розныя пункты гледжання і розныя ракурсы аповеду ў сваіх творах, як гэта робіць адзін з самых папулярных на сённяшні дзень чэшскіх празаікаў Вівэг, які стварае ў сваіх кнігах новыя падобы мастацкай праўды, якую нельга ні "ідэйна" пацвердзіць, ні перайначыць. Гульня паміж рэальнасцю і фікцыяй, да якой звяртаецца Вівэг, вабіць вельмі многіх сучасных чэшскіх пісьменнікаў. Фантастыка і містыфікацыя становяцца амаль самымі распаўсюджанымі рысамі тэкстаў чэшскіх літаратараў.

Цяпер у чэшскай літаратуры прадстаўлена адначасова некалькі пакаленняў з рознай мастацкай і эстэтычнай арыентацыяй. Паспрабуем у гэтай вялікай колькасці вылучыць пэўныя тэндэнцыі, тэмы, схільнасці.

Сярод пісьменнікаў-дэбютантаў пераважаюць паэты. Даследчыкі жартуюць, што іх амаль столькі, колькі чытачоў. Няпэўнасць і неўсталяванасць самой эпохі спрыяе таму, што сучасная чэшская паэзія вельмі часта выступае як своеасаблівая тэрапія схільнасці да самазабойства. Тут можна згадаць вершы Мілана Корала, Рамана Склянічкі. Але не заўсёды такія лекі дзейсныя,



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

на што ўказвае дабравольнасць адыходу з жыцця такіх талентаў, як Міхал Чапек, Пётр Ракас, Лукаш Томін альбо Яраслаў Коцвера. Даволі прадстаўнічай плынню 1990-х гг. становіцца спірытуалістычная паэзія, якая проста перажывае рэнесанс. Прыхільнікі гэтага кірунку абапіраюцца перш за ўсё на ідэі каталіцкага веравучэння (Пётр Боркавец, Мілаш Долежал, Эвальд Мурэр, Даніэла Седлачкава, Пётр Чыхонь, Павел Петр і некаторыя інш.). Сярод паэтаў вылучаецца таксама група, якая вельмі крытычна ставіцца да пасляпістападаўскага развіцця і чые творы часта набываюць форму і характар палітычнага памфлета. Гэта Алоіс Рэйх, Ярамір Семела, Ян Вальны і інш. Гэтыя літаратары бачаць свой ідэал у творчасці паэтаў кшталту Карла Сыса, Даніїла Строжава. Новую хвалю папулярнасці перажывае чэшскі сюррэалізм у творах Алены Надворнікавай, Францішка Дрые, Андрэва Ласа, Ярапміра Тыпплта.

Паміж новымі чэшскімі аўтарамі шэраг прыхільнікаў знайшоў постмадэрнізм. Усімі прызнанай сучаснай класікай сталі тэксты Марціна Камарэка, Пятра Коўдэлькі, Пятра Ульрыха. Постмадэрнісцкая паэтыка, бясспрэчна, паўплывала на самага чытабельнага з маладых – чэшскага празаіка Міхала Вівэга, які выклікае шмат неадназначных і спрэчных ацэнак сваімі кнігамі. Тое ж можна сказаць і пра Йржы Дранінара, чые раманы вылучаюцца вялікім скепсісам. З паэтаў даніну постмадэрнісцкаму светабачанню аддалі Пётр Ракас (галоўным клопатам якога сталі моўныя эксперыменты і фармальныя інавацыі), Яраслаў Піжл, Яраслаў Ванчы. Рысы постмадэрнізму выяўляюцца ў творах Яхіма Топаля, Пятра Плацака, Зузаны Брабцавай, Вацлава Душака, Ёзафа Фрайса, Яраслава Вэйса, Яны Чэрвенкавай, Зэна Достала, Вацлава Ямэка, Уладзіміра Мацуры, Іржы Кратахвіла, Даніэлы Годравай, Яна Кржэсадлы, Міхала Тржэшціка, Аляксандры Беркавай, Здэнэка Заплетала і некаторых інш.

Адной з найвыразнейшых тэндэнцый чэшскай літаратуры першай паловы 1990-х гг. стала аўтарская і чытацкая схільнасць, а таксама цікавасць да дзённікавай і мемуарнай літаратуры. Даследчыкі чэшскай літаратуры (напрыклад, Павел Яноўшэк) гавораць нават пра гіпертрафію названага жанру. Кнігі ўспамінаў Іржы Совака, Уласціміла Бродскага, Мілаша Копецкага ў літаратурных і камерцыйных рэйтынгах займаюць першыя радкі. Своеасаблівай жанравай мадыфікацыяй мемуарнай літаратуры сталі размовы са знакамітымі пісьменнікамі, акцёрамі. Падобныя размовы выдаюцца тоўстымі кнігамі і выклікаюць значную ўвагу аўдыторыі. Форма і характар чэшскай мемуарыстыкі вельмі разнастайныя – ад традыцыйнай рэканструкцыі жыццёвага і творчага шляху (Ян Боўз, Нона Аўска) да філасофска-культуралагічнай рэфлексіі выбітных асоб навукі і культуры (Здэнек Кожмін, Сяргей Махонін, Ёзэф Вашэк) альбо аўтабіяграфічных споведзяў маладых зорак



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

спорту, поп-музыкі і кінематаграфіі (Ярамір Ягр, Ігар Хаўн). Адной з рыс сучаснай мемуарыстыкі стаў выразны эксгібіцыянізм. Таму не дзіўна, што з'явіліся і пародыі на гэты папулярны сёння жанр (Ян Антанін Піцінскі), і нават міфічныя фальшывыя аўтабіяграфіі, як, напрыклад, у Патрыка Оўржадніка. Пэўнага рэнесансу дачакаліся і жыццяпісы, галоўным чынам, так званых пакутнікаў веры і тых знакамітых людзей, чыім лёсам стала цяжкая хвароба. Сярод аўтараў такога кшталту твораў можна назваць Карэла Дахоўскага, Пятра Пагорскага, Антонію Гофманаву.

Традыцыйна значнае месца ў панараме сучаснай чэшскай літаратуры займае гістарычны раман. Адрозненне гістарычнай прозы 1990–2000-х гг. ад папярэдняй традыцыі ў тым, што большасць аўтараў скарыстоўвае фармальныя прыёмы і постмадэрнісцкія падыходы да гістарычнага матэрыялу (Уладзімір Мацура, Уладзімір Кёрнер, Здэнек Шмід). На тэму чэшска-нямецкіх гістарычных стасункаў піша Вацлаў Вокалек. Моўную рафінаванасць і погляд на рэчаіснасць без ілюзій спалучае ў сваіх гістарычных творах малады аўтар Макс Марыска. Іржы Драшнар вылучыўся сваёй мадыфікаванай сямейнай сагай "Пра рэвалюцыі, тайныя таварыствы і генетычны код".

Нельга абмінуць увагай багатую старадаўнімі традыцыямі чэшскую гумарыстычную і сатырычную плынь у літаратуры. Актуальную грамадскую сатыру спрабуе ўвасобіць Здэнэк Блажак. Да мінуўшчыны звяртаюцца Тэафіль Б. Кулка, Уладзімір Кунцытр. Вельмі лёгкія гумарыстычныя чытанні належаць Міраславе Моўчкавай, Іржы Махалаку, Ірэне Сэгнеравай. Гумарыстычныя і сатырычныя элементы сталі неаддзельнай часткай прозы Міхала Вівэга, які ў кнізе "Нечаканыя ідэі ласкавага чытача" стварыў іранічныя пародыі на сваіх тытулаваных калег (Багуміла Грабала, Ёзэфа Шкворэцкага, Мілана Кундэру, Эрнэста Хэмінгуэя і інш.).

Прынята вылучаць жаночую і феміністычную літаратуру. Ідэі фемінізму развівае ў сваіх творах Карола Біедэрманава, Эва Гаўсэрава. Адной з самых таленавітых пісьменніц-жанчын сёння прызнана Даніэла Годрава, мастацкі свет якой часта параўноўваюць з творамі Ладзіслава Фукса. Ні больш ні менш як культавую пісьменніцу ўспрымаюць Даніэлу Фішэраву. Масавага поспеху сваімі кнігамі дасягнула Галіна Паўлоўская. Сугестыўную экзістэнцыяльную рэфлексію над жаночым лёсам увасобіла ў вершах Віола Фішэрава. Сярод малодшых чэшскіх паэтак вылучаецца сваім талентам Бажэна Спраўцава. У межах так званага "чытання для жанчын" плённа працуе Вера Ржэгачкава. Блізкасць да ўзаемапранікнення літаратуры і мастацтва рэпрэзентуе ў сваіх літаратурных спробах Алена Надворнікава.

Дастаткова прадуктыўна развіваецца на сучасным этапе чэшская навуковая фантастыка (Ян Главічка, Іван Кмінэк, Ёзаф Пэцыноўскі, Вільма Кадлечкава). Камбінацыю фантастыкі і чорнага гумару ўяўляюць сабой творы



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Эрвіна Крба, узбагаціць і аднавіць названы жанр спрабуе Яраслаў Мастэцкі. Характэрна, што многія чэшскія аўтары-фантасты выдаюць свае кнігі пад англійскімі імёнамі.

Адкрытасць дзяржаўных межаў стала пасля лістапада 1989 г. крыніцай новага літаратурнага феномена. Павышэнне моўнай адукаванасці і міжнародных стасункаў вызвалі да жыцця напісанне і выданне твораў чэшскіх аўтараў на іншых мовах (Лукаш Томін, Алеш Углірж) альбо на дзвюх мовах (Вера Вейсліцава). І наадварот, чэшская мова стала сродкам самавыражэння прадстаўнікоў іншых народаў (славакі Якуб Бернард і Ёзаф Юнас, паляк Францішак А. Белашэўскі).

Такім чынам, можна канстатаваць шматлікасць і разнастайнасць мастацкіх тэндэнцый у сучасным чэшскім літаратурным жыцці. Трэба ўлічваць і тое, што не ўсе імёны і з'явы яшчэ атрымалі сваю ацэнку і месца. Гісторыя чэшскай літаратуры і культуры другой паловы XX стагоддзя да апошняга часу з-за шэрагу пэўных гістарычных падзей мела шмат белых плямаў нават для носьбітаў нацыянальнай ментальнасці, мовы, і два апошнія дзесяцігоддзі сталі вельмі значнымі для чэшскай літаратуры ў сэнсе паўнавартаснага запаўнення такіх лакун. Сёння чэшскі і сусветны чытач, у рэшце рэшт, у поўным аб'ёме і без забарон знаёміцца з выдатнейшымі імёнамі і творамі.

## Літаратура


1. *Kratochvil, J.* Obnovení chaosu v české literature / J. Kratochvil. – Praha: Albatros, 1992. – 246 s.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова